Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. ПЯТНІЦА № 193 (27803) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



## За чый кошт можна адрамантаваць пад'езд

СТАР. 4



## Беларусы збіраюць памятныя рэчы Другой сусветнай

СТАР. 13

# Вабіць фарэллю «Вабіч»

**У ПМК-83 «Вадбуд», што ў Бялыніцкім раёне Магілёўшчыны, гаспадарка спраўная. Пабудавалі базу адпачынку «Вабіч», дзе ў двухпавярховых дыхтоўных доміках можна выдатна правесці вольны час з сям'ёй або кампаніяй, выкапалі сажалкі, у якіх пасялілі карпа, амура, шчупака і нават далікатэсную фарэль. Цяпер госці могуць не толькі купіць свежую жывую рыбу, але і пасядзець з вудай каля вады. Дырэктар прадпрыемства Андрэй ЦАРЫКАЎ і галоўны рыбавод Міхаіл ШКОЛЬНІКАЎ рыбным «статкам» задаволеныя: хопіць і на продаж, і турыстам.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**17 праектаў**

*дакументаў, накіраваных на далейшае развіццё міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў гуманітарнай галіне, у галіне забеспячэння бяспекі і іншых сферах, вынесены на парадак дня пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, якое адбудзецца сёння ў Мінску. Таксама сёння ў беларускай сталіцы адбудуцца пасяджэнні Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10640,00 | ▲ |
| Еўра | 13580,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 266,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 821,62 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Падзея

## ДАГАВОР АБ ЕАЭС РАТЫФІКАВАНЫ

### А падатковы манеўр Беларусі кампенсуюць

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон аб ратыфікацыі дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе.**

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КАБЯКОЎ** звяртае ўвагу на тое, што ў тэксце падпісанага закона цалкам змешчана заява, якую рабіў беларускі лідар яшчэ 29 мая ў Астане. Сутнасць заявы ў тым, што Беларусь будзе добрасумленна выконваць свае абавязацельствы ў межах дагавора і прадпрыме іншыя захады па яго рэалізацыі пры ўмове, што да гэтага моманту будуць дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці аб зняцці бар'ераў, абмежаванняў, выключэнняў у гандлі асобнымі таварамі і аказанні асобных відаў паслуг, у першую чаргу ў дачыненні да энерганосьбітаў. І нашы заканадаўцы паўтарылі гэтую заяву падчас ратыфікацыі. «Справа ў тым, што ў працэсе падрыхтоўкі дагавора аб ЕАЭС дамовіліся, што да 2025 года будуць захоўвацца тыя ці іншыя адчувальныя для бакоў выключэнні і абмежаванні ў гандлі. Усё гэта было строга абумоўлена. Памер самага адчувальнага для Беларусі выключэння па вуглевадародах ва ўмовах 2014 года складае каля 3,3 млрд долараў. Гэта аб'ём вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, якія мы прадаём на экспарт»,— паведаміў Андрэй Кабякоў.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама нагадаў, што яшчэ ў 2010 годзе пры стварэнні Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы было дамоўлена, што ўсе вывазныя мытныя пошліны ад экспарту нафтапрадуктаў, якія выраблены з расійскай нафты, будуць пералічвацца ў бюджэт Расійскай Федэрацыі.

СТАР. 2

■ Прафесійная школа

## ДАРАГІЯ РАБОЧЫЯ РУКІ...

**Як сведчаць вынікі апытання, праведзенага Навукова-даследчым інстытутам працы ў арганізацыях розных формаў уласнасці, больш за 65% з іх адчуваюць дэфіцыт кадраў рабочых і служачых.**

— На жаль, рынак працы яшчэ не стаў прамым заказчыкам прафесійных адукацыйных паслуг, у выніку чаго марудна скарачаецца дыстанцыя паміж попытам рынку працы на кадры і прапановамі прафесійнай адукацыі,— паведаміў на калегіі Міністэрства адукацыі, прысвечанай падрыхтоўцы кадраў з прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.** — У прагназаванні патрэб практычна не ўдзяльнічаюць арганізацыі малога і сярэдняга бізнесу. І заказы на падрыхтоўку кадраў не адлюстроўваюць патрэбы ў новых кваліфікацыях. Фактычна адсутнічаюць заяўкі на падрыхтоўку рэдкіх і малакалькасных прафесій.

СТАР. 3



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.